Источник: **«Звязда» - 2012-11-14**

## Міцкевічы

**Міцкевіч — знакавае прозвішча для Беларусі. Імёны двух носьбітаў гэтага прозвішча — Адама Бернарда Міцкевіча і Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча (Якуба Коласа) — залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю сусветнай літаратуры.**

**Адам Міцкевіч — паэт-рамантык еўрапейскага маштабу**

Адам Міцкевіч (1798—1855) — паэт, палітычны публіцыст, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху. Ён лічыцца адным з найвялікшых польскіх паэтаў эпохі рамантызму. Разам з тым, Міцкевіч зрабіў вялікі ўклад у станаўленне і развіццё беларускай літаратуры. Па словах вядомага паэта і вучонага Алега Лойкі, "Адам Міцкевіч сёння трактуецца не толькі як вялікі польскі паэт, прарок, геній, але і як магутная асоба, геніяльны творца, што адкрываў свету і Беларусь, і беларускую мову, і беларускую гісторыю, стаўшы дзейсным каталізатарам развіцця беларускай літаратуры". Нарадзіўся паэт не ў карэннай Польшчы, а на зямлі былога Вялікага Княства Літоўскага — у засценку Завоссе непадалёку ад першай сталіцы ВКЛ, Наваградка. Бацька яго быў прадстаўніком збяднелай шляхты, маці паходзіла з сям'і хрышчоных яўрэяў. Самога Міцкевіча хрысцілі ў фарным касцёле Наваградка. Адукацыю будучы паэт атрымаў у дамініканскай школе, затым паступіў у знакаміты Віленскі ўніверсітэт, дзе прыняў удзел у стварэнні і дзейнасці патрыятычных моладзевых гурткоў філаматаў і філарэтаў. Пасля заканчэння ўніверсітэта служыў у Коўне. За філамацкую дзейнасць быў высланы з Радзімы. Далейшы жыццёвы шлях паэта быў звязаны з гарадамі Санкт-Пецярбург, Адэса, Еўпаторыя, Бахчысарай, Масква, Лазана, Жэнева, Рым, Дрэздэн, Веймар, Парыж, Лондан, Канстанцінопаль. Але не толькі геаграфія мясцін, дзе жыў паэт, зрабіла яго паэтам агульнаеўрапейскага маштабу, але і тое, з кім ён сустракаўся, сябраваў або быў у канфрантацыі. Як піша А. Лойка, "У Расіі ў Пецярбургу і Маскве Міцкевіч стаў пабрацімам Аляксандра Пушкіна, у Веймары здзіўляўся генію Ёгана Вольфганга Гётэ, у Лондане яму насустрач выходзіў вялікі мігрант царскай Расіі Аляксандр Герцэн, а Рым дасюль памятае яго аўдыенцыю ў Папы Рымскага".

Адам Міцкевіч напісаў вялікую колькасць твораў сусветнага значэння, але сапраўднымі шэдэўрамі сталі балады і паэмы "Дзяды" і "Пан Тадэвуш" — арыгінальныя творы як па форме, так і па змесце, у якіх адлюстраваліся старонкі гісторыі, фальклорныя матывы, традыцыі антычнасці, Сярэднявечча, Адраджэння і Асветніцтва, былі ўзняты ідэйна-філасофскія праблемы сучаснасці. На беларускую і рускую мовы творы Адама Міцкевіча перакладалі В. Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала, Б. Тарашкевіч, Р. Барадулін, А. Пушкін, К. Бальмонт, В. Брусаў, І. Севяранін, М. Лермантаў, І. Бунін і іншыя.

Пражыў Адам Міцевіч усяго 57 гадоў. Паводле адной з версій, паэт падчас эпідэміі захварэў на халеру і памёр 26 лістапада 1855 года ў Канстанцінопалі. Паводле іншай (непацверджанай) версіі, Адама Міцкевіча атруцілі. У 1890 годзе прах паэта быў перавезены з Парыжа ў Кракаў і змешчаны ў саркафаг у Вавельскім кафедральным саборы.

**Канстанцін Міцкевіч (Якуб Колас) — адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы**

Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас) — беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, крытык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч. Як слушна адзначае

член-карэспандэнт НАН Беларусі М. Мушынскі, Якуб Колас — "пісьменнік самабытнага таленту, адзін з пачынальнікаў айчыннай мастацкай прозы, аўтар шэдэўраў нацыянальнага ліра-эпасу, стаў сапраўдным узорам самаадданага служэння Бацькаўшчыне, сімвалам велічы, духоўнага здароўя нацыі, яе жыццёвай моцы". Нарадзіўся паэт 3 лістапада1882 года ў вёсцы Акінчыцы (сучасны Стаўбцоўскі раён). Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, настаўнічаў у вёсках Люсіна і Пінкавічы (Пінскі раён), у Верхменскім народным вучылішчы (Смалявіцкі раён), Пінскім прыходскім вучылішчы. Працаваў у газеце "Наша Ніва". Падчас Першай сусветнай вайны быў мабілізаваны ў армію. У званні прапаршчыка скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча. Служыў у запасным палку ў горадзе Перм, атрымаў чын падпаручніка. У 1921 годзе вярнуўся ў Беларусь. Працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Народнага камісарыята асветы, выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме, чытаў лекцыі на настаўніцкіх педагагічных курсах у Слуцку. З'яўляўся членам Прэзідыума і віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук БССР. Якубу Коласу было прысвоена высокае званне народнага паэта Беларусі, найвышэйшая вучоная ступень акадэміка Акадэміі навук Беларусі, ён стаў заслужаным дзеячам навукі Беларусі. Памёр пісьменнік 13 жніўня 1956 года, пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.




Якуб Колас — класік беларускай літаратуры, першаадкрывальнік новых шляхоў у літаратуры. Паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка" адносяцца да лепшых здабыткаў прыгожага пісьменства. У неўміручым паэтычным шэдэўры "Новая зямля" адлюстравана цэлая эпоха ў жыцці беларускага народа, раскрыта яго духоўная веліч, маральная прыгажосць чалавека працы, выяўлена імкненне стаць гаспадаром на сваёй зямлі. Ліра-эпічная паэма "Сымон-музыка" — твор аб лёсе таленту з народа і духоўным адраджэнні нацыі. Трылогія "На ростанях" з'яўляецца адным з найбольш любімых і

папулярных твораў, у якім сцвярджаюцца ўзвышаныя гуманістычныя ідэалы. У аповесці "Дрыгва" з асаблівай паўнатой і яскравасцю выяўляюцца рысы нацыянальнага характару. Глыбокім філасофскім зместам і мастацкай дасканаласцю вызначаюцца алегарычныя апавяданні "Казкі жыцця". Якуб Колас з'яўляецца пачынальнікам беларускай дзіцячай літаратуры. Псіхалогія дзяцей тонка раскрыта ў яго паэмах, апавяданнях і вершах. Веліч і шматграннасць таленту Якуба Коласа выявілася таксама ў яго гумарыстычных замалёўках, навуковых працах па педагогіцы і літаратуразнаўстве, публіцыстычных артыкулах па актуальных пытаннях грамадска-культурнага і міжнароднага жыцця.

**Іншыя знакамітыя Міцкевічы**

Сярод шматлікіх носьбітаў прозвішча <I>Міцкевіч ёсць многа таленавітых людзей:

*Юльян Аляксандр Міцкевіч,* брат Адама Міцкевіча, гісторык права, член таварыства філаматаў, прафесар Кіеўскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў, аўтар "Энцыклапедыі права" і "Курса рымскага права".

*Барыс Паўлавіч Міцкевіч,* літаратуразнавец, даследчык сучаснага замежнага рамана;

*Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч,* сын Якуба Коласа, беларускі дзеяч культуры, вучоны-хімік, дэкан хімфака БДУ (1943 год), вучоны сакратар Інстытута хіміі Акадэміі навук БССР, збіральнік спадчыны народнага песняра, арганізатар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, з 1957 па 1980 год дырэктар гэтага музея;

*Інеса Міхайлаўна Міцкевіч,* беларускі журналіст, Заслужаны работнік культуры Беларусі, даследчык сацыяльных праблем беларускай вёскі, аўтар і ўкладальнік кніг нарысаў;

*Мікалай Антонавіч Міцкевіч,* беларускі рэжысёр і акцёр, Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Акцёр Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Беларускага тэатра імя Якуба Коласа, рэжысёр тэатраў ва Украіне;

*Мікалай Іванавіч Міцкевіч,* беларускі фізікахімік, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік-сакратар Аддзялення хімічных і геалагічных навук НАН Беларусі;

*Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч,* сын Якуба Коласа, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі матэрыялаў, доктар тэхнічных навук, майстар спорту па стэндавай стральбе, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**Паходжанне прозвішча**

Прозвішча Міцкевіч паходзіць ад кананічнага хрысціянскага імя *Дзімітрый, Дзмітрый* (імя паходзіць з грэчаскай мовы, дзе літаральна абазначала "прысвечаны Дзяметры — багіні земляробства і ўрадлівасці). Трапіўшы на славянскую моўную глебу, імя Дзмітрый утварыла шэраг народна-размоўных варыянтаў: *Дзіма, Дзімуля, Дзімок, Дзімуша, Дзмітра, Дзмітро, Дзміцерка, Дзмітрук, Дзмітрык, Змітрый, Змітр, Зміцер, Зміцерка, Змітра, Змітро, Змітрок, Змітрук, Змітрык, Мітрый, Міць, Міця, Міцё, Міценька, Міцёк, Міцёш Міцёша, Міцюк, Міцюша, Міцяй, Дзімарык, Дзімчык, Дзімулька, Дзімцюрык, Змітрачок, Змітручок, Змітрычак, Міцюша, Зысік.* У цэнтры гэтага рада варыянтаў знаходзіцца размоўны варыянт *Міцька (Міцько),* які і быў пакладзены ў аснову прозвішча *Міцкевіч*. Фіналь — *іч* указвае на тое, што носьбіты гэтага прозвішча з'яўляюцца нашчадкамі чалавека па імені *Міцько (Міцька)*.

**Сучасныя Міцкевічы**

На тэрыторыі Беларусі зафіксаваны толькі тры населеныя пункты з назвай Міцкевічы: у Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, Гродзенскім і Смаргонскім раёнах Гродзенскай вобласці

А вось прозвішча *Міцкевіч* адносіцца да ліку папулярных. Пра гэта сведчыць шырокая геаграфія гэтага прозвішча: Баранавіцкі, Бярозаўскі, Івацэвіцкі, Камянецкі, Кобрынскі, Пружанскі раёны Брэсцкай вобласці, Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Гарадоцкі, Докшыцкі, Полацкі, Сенненскі, Талачынскі, Ушацкі раёны Віцебскай вобласці, Гомельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Кармянскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі, Светлагорскі раёны Гомельскай вобласці, Астравецкі, Ашмянскі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Слонімскі, Смаргонскі, Шчучынскі раёны Гродзенскай вобласці, Глускі, Шклоўскі раёны Магілёўскай вобласці, Капыльскі, Крупскі, Лагойскі, Любанскі, Маладзечанскі, Мядзельскі, Пухавіцкі, Слуцкі, Смалявіцкі, Стаўбцоўскі, Чэрвенскі, Мінскі раёны Мінскай вобласці, горад Мінск. Неаднаразова сустракаецца гэтае прозвішча і на тэрыторыі суседніх дзяржаў: Літвы, Польшчы, Украіны і Расіі.

**Ігар Капылоў.**